# МАТЕРИАЛЫ КОНСУЛЬТАЦИИ

**Тэма:** Сучасныя падыходы да выкладання беларускай мовы ў першым классе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання

**Консультант:** Жиловачик А.П., учитель начальных классов

Адзванілі першыя званкі, прайшлі святочныя лінейкі і пачаліся школьныя будні. Цяжэй за ўсіх прыходзіцца першакласнікам – новы настаўнік, новыя абставіны і новая мова – беларуская. Як пазбегнуць стрэсавых момантаў на першых уроках навучання беларускай мове?

Каб "не напалохаць" вучняў беларускай мовай, першы ўрок я раю пачаць на рускай мове, паступова ўводзячы дзяцей у гучанне беларускага слова. Напрыклад, так:

- Сегодня у нас необычный урок. Мы начинаем изучать белорусский язык. Он очень похож на русский язык. Скажите, кто из вас слышал, как говорят по-белорусски? Где и когда это было? Кто знает слова белорусского языка? Стихи или песни на белорусском языке? Какие?

- А теперь послушайте и скажите, на каком языке я с вами говорю: «Мы пачынаем вывучаць беларускую мову. Гэта родная мова беларусаў». Кто знает, на каком языке прозвучали слова? Попробуйте ответить на мой вопрос: якую мову мы пачынаем вывучаць?

У 2017/2018 навучальным годзе выкладанне беларускай мовы ў 1 класе ажыццяўлялася па абноўленым падручніку, які цалкам адпавядае вучэбнай праграме. Нагадаем, што ў ёй для вучняў 1 класа прапануецца вусны курс беларускай мовы – гэта не ўласна навучанне мове, а хутчэй уводзіны ў беларускую мову, асноўная задача якіх заключаецца ў стварэнні эмацыянальна-пазнавальнага асяроддзя вакол прадмета навучання, выхавання станоўчых адносін да прадмета «Беларуская мова».

Вусны курс прадстаўлены трыма зместавымі лініямі:

- навучанне асэнсаванаму ўспрыманню беларускай мовы на слых;
- назапашванне лексічнай базы беларускай мовы;
- прапедэўтычнае навучанне чытанню на беларускай мове.

Зместавыя лініі рэалізуюцца ў падручніку. Кожны разварот падручніка ўтрымлівае матэрыял аднаго ўрока, які змяшчае пэўную тэму і аб'яднаны тэматыкай вывучаемай лексічнай групы.

*Напрыклад. Тэма "Мая кватэра". Лексічная група слоў: крэсла, канапа, шафа і г.д. (фота с. 16 падручніка).*

Мэтанакіраваная выпрацоўка навыкаў распазнавання ў маўленні і вымаўлення спецыфічных гукаў ([г], [ў], [дз'], [дж], [р], [ч], [ц´], спалучэнне [шч]) павінна праводзіцца на кожным уроку беларускай мовы. Паэтапная сістэма вымаўленчых практыкаванняў прадстаўлена як структурны кампанент урока "Маўленчая размінка" .

Вельмі добра гэты кампанент рэалізуецца ў сшытку-дапаможніку “Вывучаем мову цікава і займальна разам” праз чыстагаворкі, скорагаворкі, табліцы складоў (с 19).

Каб дзеці маглі ўспрымаць вусную інфармацыю на беларускай мове з неабходнай ступенню асэнсаванасці на старонках падручніка даецца загаловак твора, які вучні будуць успрымаць на слых, і малюнкі па змесце твора. У большасці выпадкаў яны зроблены на аснове сюжэтаў літаратурных твораў, праслухоўванне якіх забяспечвае фарміраванне ўменняў асэнсаванага ўспрымання тэкстаў на беларускай мове, спрыяе назапашванню лексікі і з’яўляецца зместавым матэрыялам для чытання. (с. 5, падручнік).

**Навучанне асэнсаванаму ўспрыманню беларускай мовы на слых**

Каб сфарміраваць уменні асэнсаванага ўспрымання на слых, праца з тэкстам і малюнкамі арганізуецца па наступным плане:

**1.** ***Перадмаўленчыя практыкаванні па падрыхтоўцы да ўспрымання твора, верагоднаснае прагназаванне яго зместу па малюнках і загалоўку.***

Настаўнік прапануе вучням разгледзець малюнкі, назваць герояў, прааналізаваць, што адбывалася, паведамляе загаловак тэксту і просіць спрагназаваць, што адбудзецца. У працэсе гэтай працы павінны быць раскрыты значэнні найбольш важных для разумення твора слоў.

У якасці прыкладу прывяду распрацоўку часткі ўрока па тэме **“Наша мова”**

- Разгледзьце малюнак. Каго на ім бачыце? (Настаўнік называе дзеючых асоб па-беларуску). Тэкст навываецца “Як Мікітка сукенку з’еў”. Як завуць хлопчыка? Хто ведае, што такое па-беларуску “сукенка”? Ці можна яе з’есці? “Што такое "цукерка", "перакладчык"”? Хочаце даведацца, пра што размаўлялі бабуля з унукам?

**2.** ***Мэтавыя ўстаноўкі перад слуханнем.***

Ставіцца заданне ці пытанне для канцэнтрацыі ўвагі і палягчэння разумення твора.

- Слухайце ўважліва, потым скажаце, ці сапраўды Мікітка з’еў сукенку.

**3.** ***Успрыманне твора на слых, актуалізацыя ў час слухання.***

Настаўнік чытае тэкст і прасочвае эмацыянальную рэакцыю дзяцей, сканцэнтраванасць іх увагі. Калі трэба, спыняецца і задае пытанне, якое дазваляе зняць непаразуменні ў змесце тэксту.

Напрыклад.

Бабуля ж пачала:

- Клюква.

- Журавіны. *(Пакажыце на малюнку ў падручніку.)*

- Лук.

- Цыбуля. *(Пакажыце.)*

- Картошка.

- Бульба. *(Пакажыце.)*

- Сахар.

- Цукар. *(Пакажыце.)*

- Бумага.

- Папера. *(Пакажыце.)*

- Аист.

- Бусел... *(Пакажыце.)*

***4. Суразмоўніцтва па змесце праслуханага.***

Вучні запытваюцца пра незразумелыя словы, настаўнік тлумачыць іх значэнне. Калі словы могуць быць зразумелыя з кантэксту, то настаўнік прачытвае ўрывак з твора і просіць выказаць здагадкі пра іх значэнне. У гутарцы па змесце твора вучні прасочваюць сюжэтную лінію, асэнсоўваюць значэнне і ролю прыказак і прымавак, фразеалагічных выразаў, вылучаных з тэксту настаўнікам, выкарыстоўваюць лексіку, засвоеную ў працэсе працы над творам, выказваюць уласнае стаўленне да падзей тэксту.

Напрыклад.

- Што з’еў Мікітка? Якія словы ён пераблытаў? Што трэба ведаць, каб правільна гаварыць па-беларуску? Разгледзьце малюнкі. Назавіце словы, якія загадвала бабуля ўнуку. Назавіце іх па-беларуску. Запытайцеся адзін у аднаго.

**Назапашванне лексічнай базы беларускай мовы**

Азнаямленне з лексікай беларускай мовы прадугледжваецца на кожным уроку беларускай мовы ў 1 класе. Для лепшага засваення прапанаванай лексікі яна аб’яднана ў больш буйныя групы. Напрыклад: лексічная група “настаўніца і вучні” ўваходзіць у тэму “Я і мая школа”. Такая структура дазваляе засвойваць і выкарыстоўваць лексіку, аб’яднаную адной тэматыкай, на працягу некалькіх урокаў. Звяртаю ўвагу на тое, што трэба паступова весці работу па ўжыванні вучнямі слоў беларускай мовы ў маўленні: выкарыстоўваць іх пры адказе на пытанні, выказванні ўласных думак, нават тады, калі ўсё выказванне пабудавана па-руску.

На засваенне лексікі скіраваны і ўвесь матэрыял падручніка. Спачатку даюцца малюнкі, у гутарцы па каторых настаўнік знаёміць вучняў з новымі словамі і выразамі, ажыццяўляе першаснае замацаванне праз адказы вучняў на пытанні з выкарыстаннем новых слоў. Як правіла, гэтаму прысвечана левая старонка развароту падручніка (с. 14, падручнік). Далейшае замацаванне слоў адбываецца ў працэсе слухання і суразмоўніцтва па праслуханым творы, які таксама тэматычна звязаны з лексікай, што вывучаецца. Звычайна ён займае другую частку развароту. У якасці прыкладу разгледзем, як адбываецца ўвядзенне лексічнай тэмы **“Я і мая сям'я. Мае сваякі”** (урок 6, с. 14 падручніка):

**1) Уступная гутарка**

- У кожнага чалавека ёсць родныя людзі --
сваякі *(родственники)*. Сягоння даведаемся, як іх называюць па-беларуску.

Паслухайце верш. Запомніце словы, якія называюць сваякоў:

Мы -працоўная сям'я:
дзед, бабуля,
тата, мама,

брат з сястрой,
таксама -я.

*В. Лукша*

- Назавіце сваякоў, пра якіх гаворыцца ў вершы.

**2) Работа па падручніку**

- Разгледзьце малюнак. Знайдзіце і пакажыце дзядулю, бабулю. Вымавіце гэтыя словы хорам. Хто прыехаў да іх у госці? Што робіць хлопчык? Кім ён прыходзіцца дзядулі і бабулі, маме і тату? Што робіць дзяўчынка? Кім яна прыходзіцца дзядулі і бабулі, маме і тату?

Неабходна ўвесь час звяртаць увагу на тое, каб вучні выкарыстоўвалі ў сваім маўленні новыя словы.

Зноў звяртаемся да друкаванага сшытка «Вывучаем мову цікава і займальна разам». Разгледзем прапанаваныя заданні для замацаванне тэмы "Я і мая сям'я. Мае сваякі" (с. 16 №1, 2).

**Прапедэўтычнае навучанне чытанню на беларускай мове**

Навучанне чытанню на беларускай мове ў 1 класе паступова адбываецца пасля таго, як вучні авалодаюць навыкам чытання на рускай мове.

Перанос навыку чытання арганізуецца так. На першым этапе вучні чытаюць словы, якія не адрозніваюцца ў рускай і беларускай мовах Настаўнік паведамляе, што чытаюць па-беларуску так, як і па-руску: глядзяць на літары і агучваюць іх.

На другім этапе сярод слоў, прапанаваных для чытання, сустракаюцца словы ўласнабеларускай лексікі, з якімі вучні сутыкаліся пры праслухоўванні твора. Чытанне такіх слоў абавязкова павінна суправаджацца тлумачэннем вучнямі іх значэнняў.

На трэцім этапе навучанне чытанню арганізуецца як самастойная частка ўрока па наступным плане:

**1.** ***Маўленчая размінка.***

Настаўнік узнаўляе фанетыка-артыкуляцыйныя характарыстыкі гука; у займальнай форме знаёміць вучняў з новай літарай, чытанне складоў з літарай, што вывучаецца (адпаведная частка ўрока ў падручніку абведзена блакітнай рамачкай).

**2.** ***Перадмаўленчыя практыкаванні па падрыхтоўцы да чытання.***

Чытанне слоў з новай літарай вучнямі, правільная пастаноўка націску, вызначэнне незразумелых слоў, падрыхтоўка да чытання (падкрэсліванне літар, якія чытаюцца па-беларуску своеасабліва).

**3.** ***Чытанне тэксту.***

Настаўнік чытае тэкст, вучні сочаць па падручніку, фіксуюць незразумелыя словы.

**4.** ***Суразмоўніцтва па прачытаным.***

Вучні запытваюцца пра незразумелыя словы, адказваюць на пытанні настаўніка па змесце з выкарыстаннем выбарачнага чытання, устанаўліваюць сэнсавую сувязь з праслуханым творам.

5. ***Узнаўленне тэксту.***

Вучні чытаюць тэкст індывідуальна ўголас, самастойна ў парах і г.д., абмяркоўваюць з настаўнікам і аднакласнікамі правільнасць чытання.

У вучэбнай праграме вызначаны тры перыяды навучання:

1. Вучымся слухаць і вымаўляць.
2. Вучымся слухаць і адказваць.
3. Вучымся слухаць, чытаць і адказваць.

У табліцы паказаны галоўныя сэнсавыя адрозненні зместу навучання ў кожны ў кожны з перыядаў навучання беларускай мовы ў 1 класе.

**Змест навучання ў залежнасці ад перыяду навучання**

| | **Вучымся слухаць і вымаўляць** | **Вучымся слухаць і адказваць** | **Вучымся слухаць, чытаць і адказваць** |
|---|---|---|---|
| **Маўленчая размінка** | Яе змест складае сістэма практыкаванняў па фарміраванні вымаўленчых навыкаў асобных гукаў, якія прэзентуюць фанетыку беларускай мовы ([г], [ў], [дз'], [дж], [р], [ч], [ц´]). | Зместам практыкаванняў становяцца больш складаныя заданні па вылучэнні на слых слоў з пэўнымі гукамі. | Выпрацоўка вымаўленчых навыкаў уваходзіць у структурны кампанент урока «навучанне чытанню». Тут адбываецца ўзнаўленне гука і абазначэнне яго літарай. |
| **Навучанне чытанню** | Увогуле адсутнічае праца па навучанні чытанню. | Паступова прапануюцца вучням для чытання словы і фразы з праслуханных тэкстаў. | Вылучаецца у самастойны структурны кампанент урока. Змест яго складаецца з узнаўлення гука, знаёмства з літарай, якой ён абазначаецца, чытання складоў і слоў з гэтай літарай. |
| **Лексіка тэматычных груп** | Асвойваюць паслядоўнасць працы з праслуханым творам, вучацца суадносіць яго змест з малюнкавым радам. | Больш увагі надаецца адказам вучняў на пытанні па праслуханым творы, працы з дэфармаваным малюнкавым радам. | Увага скіроўваецца на гутарку на аснове малюнкавага раду, узнаўленне па ім зместу твора, устанаўленне сувязі паміж праслуханым і прачытаным тэкстамі. |

Для таго каб зрабіць урокі беларускай мовы разнастайнымі, цікавымі і зразумелымі для вучняў, каб развіваць у дзяцей слыхавую памяць, арфаэпічную пільнасць, каб выхоўваць актыўную пазіцыю слухача і чытача, неабходна карыстацца наступнымі дапаможнымі матэрыяламі:

- ✓ «Беларуская мова. 1 клас. Рабочы сшытак» (выдавецтва «Аверсэв»);
- ✓ Прэзентацыя да ўрокаў беларускай мовы. 1 клас;
- ✓ Нагляддны дэманстрацыйны матэрыял у табліцах.

Акрамя гэтага, будзе карысным выкарыстанне на ўроках вучэбных наглядных дапаможнікаў:

- ✓ С. А. Жукавай «Вывучаем мову цікава і займальна разам» (выдавецтва Мазыр «Содействие»);
- ✓ Т. А. Калінічэнкі «Беларуская мова. Займальна і цікава. Рабочы сшытак» (выдавецтва Мінск «Сэр-Віт»);
- ✓ А. У. Зінкевіч, Н. В. Няборскай "Беларуская мова. Займальныя заданні для замацавання ведаў. 1 клас" (выдавецтва "Выснова");
- ✓ А. У. Зінкевіч, Н. В. Няборскай "Матэрыял для дадатковага чытання вучняў 1 класа" (выдавецтва Мазыр "Белы Вецер");
- ✓ С. Г. Барбушыны «Літарынка. Сшытак па беларускай мове 1 клас. У двух частках» (выдавецтва Мінск «Новое знание».

Ва ўмовах абмежаванага вучэбнага часу пры выкладанні беларускай мовы ў 1 класе для пашырэння і актывізацыі слоўніка вучняў, стварэння ўмовы для ўжывання набытых ведаў у маўленчай практыцы, папулярызацыі беларускай мовы для вучняў 1 класа распрацаваны факультатыўныя заняткі.

1. «Роднае слова». Аўтар Надзея Уладзіміраўна Антонава.

Вучэбна метадычнае забеспячэнне факультатыўнага курса складае:

- ✓ вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў;
- ✓ вучэбны дапаможнік для вучняў.

Змест факультатыўнага курса складаецца з наступных блокаў:

- Маўленчая этыка: словы і выразы прывітання развітання і г. д. (с.3).
- Слова ў гульні: скорагаворкі, пацешкі, загадкі і г. д. (с.42).
- Слова ў песні: калыханкі, народныя песні (с.56).
- Само слова гаворыць: прыказкі, прымаўкі (с.64).

2. «Вытокі роднай мовы». Аўтар Валянціна Сцяпанаўна Сцяпурка

У ВМК уваходзіць:

- ✓ вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў;
- ✓ рабочы сшытак для вучняў;
- ✓ табліцы (дэманстрацыйныя матэрыялы, якія ўтрымліваюць прадметную ілюстрацыю жывёлы, лексічны мінімум для засваення вучнямі па дадзенай тэме).

Змест факультатыйнага курса складзены з двух раздзелаў: «У хаце і каля хаты». Ён накіраваны на азнаямленне дзяцей са знешнім выглядам, паводзінамі, звычкамі свойскіх жывёл, птушак.

«Бор цяністы – іхні дом» - на прыкладах дзіцячай мастацкай літаратуры разглядаюцца характэрныя рысы прадстаўнікой дзікіх жывёл.

Дапаможнік уключае практыкаванні на фарміраванне чытацкага навыку, заданні, звязаныя з падрыхтоўкай да вуснага слоўнага малявання; розныя віды інсцэніроўкі, завучванне вершаў, лічылак, загадак; шмат дыдактычных гульняў.

# СТРУКТУРА ЎРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД ПЕРЫЯДУ НАВУЧАННЯ

| | **Раздзел І. Вучымся слухаць і вымаўляць** (урокі 1-10) | **Раздзел ІІ. Вучымся слухаць і адказваць** (урокі 11-21) | **Раздзел ІІІ. Вучымся слухаць, чытаць і адказваць** (урокі 11-21) |
|---|---|---|---|
| **Структура ўрокаў** | І. **Паўтарэнне вывучанага на мінулым уроку (**узнаўленне фанетычнага і лексічнага матэрыялу папярэдняга ўрока).<br>**ІІ. Маўленчая размінка** (фарміраванне фанетыка-артыкуляцыйных навыкаў вымаўлення асобных гукаў).<br>**ІІІ. Новы матэрыял** (увядзенне ў займальнай форме лексічнай тэмы).<br>**IV. Замацаванне** (практыкаванні па асэнсаваным успрыманні на слых твораў на беларускай мове з вывучанай лексікай, знаёмства з лексічнымі і граматычнымі асаблівасцямі беларускай мовы ў параўнанні з рускай мовай, напрыклад міжмоўнымі амонімамі, словамі з несупадзеннем роду; вылучэнне слоў з вывучанымі гукамі на слых).<br>**V. Вынік урока** (паўтарэнне асноўных момантаў урока ў адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі). | І. **Паўтарэнне вывучанага на мінулым уроку (**узнаўленне лексічнага матэрыялу папярэдняга ўрока).<br>**ІІ. Маўленчая размінка** (фарміраванне навыкаў распазнавання вывучаемых гукаў на слых у маўленчай плыні, правільнага вымаўлення слоў і сказаў з імі).<br>**ІІІ. Новы матэрыял** (увядзенне ў займальнай форме лексічнай тэмы).<br>**IV. Замацаванне** (практыкаванні па асэнсаваным успрыманні на слых твораў на беларускай мове з вывучанай лексікай, знаёмства з лексічнымі і граматычнымі асаблівасцямі беларускай мовы ў параўнанні з рускай мовай, напрыклад міжмоўнымі амонімамі, словамі з несупадзеннем роду і г. д.; вылучэнне слоў з вывучанымі гукамі на слых, чытанне слоў і выразаў, тэматычна звязаных з праслуханым творам).<br>**V. Вынік урока** (паўтарэнне асноўных момантаў урока ў адпаведнасці з пастаўлены мэтамі). | І. **Паўтарэнне вывучанага на мінулым уроку (**узнаўленне гука-літарнага і лексічнага матэрыялу папярэдняга ўрока).<br>**ІІ. Новы матэрыял** (увядзенне ў займальнай форме лексічнай тэмы).<br>**ІІІ. Навучанне чытанню** (узнаўленне гука, знаёмства з літарай, чытанне складоў і слоў з ёй).<br>**IV. Замацаванне** (практыкаванні па асэнсаваным успрыманні на слых твораў на беларускай мове з вывучанай лексікай, знаёмства з лексічнымі і граматычнымі асаблівасцямі беларускай мовы ў параўнанні з рускай мовай, напрыклад міжмоўнымі амонімамі, словамі з несупадзеннем роду і г. д.; чытанне тэксту, тэматычна звязанага з праслуханым творам).<br>**V. Вынік урока** (паўтарэнне асноўных момантаў урока ў адпаведнасці з пастаўлены мэтамі). |